МІНСКІ АБЛАСНЫ
ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ

**Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі**

220030, г.Мінск, вул. Энгельса, 4
www.minsk-region.gov.by
рубрыка «Электронныя звароты»
тэл. 500 42 41, факс 517 85 77

МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ
ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

**Главное управление идеологической работы, культуры и по делам молодежи**

220030, г. Минск, ул. Энгельса, 4
www.minsk-region.gov.by
рубрика «Электронные обращения»
тел. 500 42 41, факс 517 85 77

ад 25.05.2018 № 1-9/42

Лапіцкаму А.І.
AlaksiejLapicki@gmail.com

Аб разглядзе звароту

Паважаны Аляксей Іванавіч!

Галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Мінскага абласнога выканаўчага камітэта разгледжаны Ваш электронны зварот, накіраваны ў Адміністрацыю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Пракуратуру Рэспублікі Беларусь, Мінскі абласны выканаўчы камітэт адносна прывядзення назваў вуліц і іншых геаграфічных аб’ектаў у г. Жодзіна ў адпаведнасць з заканадаўствам, і паведамляем наступнае.

У Мінскай вобласці прысваенне назваў геаграфічным аб’ектам ажыццяўляецца згодна з Законам Рэспублікі Беларусь ад 16 лістапада 2010 года “Аб найменнях геаграфічных аб’ектаў” і з іншымі актамі заканадаўства: найменні геаграфічным аб’ектам прысвойваюцца на беларускай мове, з якой спосабам транслітарацыі перадаюцца на рускую мову.

Мясцовыя Саветы дэпутатаў, мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы згодна з прадугледжанымі актамі заканадаўства праводзяць адпаведную работу ў сферы найменняў геаграфічных аб’ектаў.

Жодзінскі гарадскі Савет дэпутатаў плануе ў IV квартале 2018 года правесці пасяджэнне Тапанімічнай гарадской камісіі, зацверджанай рашэннем прэзідыума Жодзінскага гарадского Савета дэпутатаў 17 верасня 2012 года № 142, па пытаннях найменняў і перайменаванняў састаўных частак і аб’ектаў транспартнай інфраструктуры г. Жодзіна, прывядзення дамавых знакаў у адпаведнасць з нарматыўнымі дакументамі і грамадскім меркаваннем з удзелам прадстаўнікоў Рэспубліканскай тапанімічнай камісіі пры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Пытанне па стварэнні на тарцовай сцяне фасада дома №3 па пр. Ф. Скарыны мастацкага пано з выявамі беларускага першадрукара Ф. Скарыны Жодзінскім гарадскім выканаўчым камітэтам прынята да ўвагі. Пры наяўнасці фінансавых сродкаў яно будзе разгледжана ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2008 года № 1372 “Аб некаторых пытаннях стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва”.

З павагай,

Выконваючы абавязкі начальніка
галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай
работы, культуры і па справах моладзі
Мінскага аблвыканкама С.А.Баранок